**Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика. 2021;1:82–87**
**Journal of the Belarusian State University. Journalism and Pedagogics. 2021;1:82–87**

*УДК 070(476)+341.485*

# ГАЗЕТА «ЗВЯЗДА»: УДАКЛАДНЕННЕ ГІСТОРЫІ ВЫДАННЯ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***В. І. КАНЮТА***[1*]

[1*]*Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, Беларусь*

Вывучаецца гісторыя аднаго з уплывовых выданняў Рэспублікі Беларусь – газеты «Звязда» – перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Метад гістарычнага расследавання дазволіў аднавіць малавядомыя падзеі, увесці ў навуковы зварот новыя факты. На падставе аналізу архіўных дакументаў і матэрыялаў уносяцца дапаўненні ў біяграфію першага рэдактара падпольнай газеты «Звязда» Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Амельянюка. Сцвярджаецца, што выданне ўнесла істотны ўклад у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі дзякуючы аб'ектыўнаму асвятленню падзей Вялікай Айчыннай вайны. Вывучэнне дзейнасці газеты «Звязда» ваеннага перыяду з'яўляецца асабліва актуальным у сітуацыі, калі назіраюцца шматлікія спробы фальсіфікацый гістарычных фактаў.

***Ключавыя словы:*** журналістыка; газета «Звязда»; Мінскае падполле; гістарычнае расследаванне; Другая сусветная вайна.

***Падзяка.*** Аўтар выказвае падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула Таццяне Уладзіміраўне Падаляк, доктару філалагічных навук, дацэнту, прафесару кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ.

# ГАЗЕТА «ЗВЯЗДА»: УТОЧНЕНИЕ ИСТОРИИ ИЗДАНИЯ ПЕРИОДА ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

***В. И. КАНЮТА***[1)]

[1)]*Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом "Звязда"», ул. Б. Хмельницкого, 10А, 220013, г. Минск, Беларусь*

Изучается история одного из влиятельных изданий Республики Беларусь – газеты «Звязда» – периода Великой Отечественной войны. Метод исторического расследования позволил восстановить малоизвестные события, ввести в научный оборот новые факты. На основании анализа архивных документов и материалов вносятся дополнения в биографию первого редактора подпольной газеты «Звязда» Героя Советского Союза Владимира Омельянюка. Утверждается, что издание внесло значительный вклад в борьбу с немецко-фашистскими захватчиками благодаря объективному освещению событий Великой Отечественной войны. Изучение деятельности газеты «Звязда» военного периода является особенно актуальным в ситуации, когда наблюдаются многочисленные попытки фальсификаций исторических фактов.

***Ключевые слова:*** журналистика; газета «Звязда»; Минское подполье; историческое расследование; Вторая мировая война.

***Благодарность.*** Автор выражает благодарность за помощь в подготовке статьи Татьяне Владимировне Подоляк, доктору филологических наук, доценту, профессору кафедры медиологии факультета журналистики БГУ.

**Образец цитирования:**
Канюта ВІ. Газета «Звязда»: удакладненне гісторыі выдання перыяду Вялікай Айчыннай вайны. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика*. 2021;1:82–87.

**For citation:**
Kanyuta VI. Newspaper «Zvyazda»: clarification of the history of the period of the Great Patriotic War. *Journal of the Belarusian State University. Journalism and Pedagogics*. 2021;1:82–87. Belarusian.

**Автор:**
***Вероника Ивановна Канюта*** – специальный корреспондент.

**Author:**
***Veronika I. Kanyuta***, special correspondent.
*veronika_kanyuta@mail.ru*

# NEWSPAPER «ZVYAZDA»: CLARIFICATION OF THE HISTORY OF THE PERIOD OF THE GREAT PATRIOTIC WAR

*V. I. KANYUTA*[a]

[a]*The editorial&publishing institution «Publishing House "Zvyazda"», 10A B. Chmiaĺnickaha Street, Minsk 220013, Belarus*

The military history of one of the most influential publications of the Republic of Belarus newspaper «Zvyazda» is being investigated. The method of historical research helps to restore little-known facts, to introduce new ones into a historical circulation. Some additional information based on the study of archival documents and materials is supplemented into the biography of the first editor of the underground newspaper «Zvyazda» Vladimir Omelyanyuk, Hero of the Soviet Union. Objectively covering the events of the Great Patriotic War, the newspaper made a significant contribution to the fight against the German fascist invaders. Studying publishing activity of «Zvyazda» during the war period is especially relevant in the situation when there are numerous attempts to falsify the historical facts and events of World War II.

***Keywords:*** journalism; the newspaper «Zvyazda»; Minsk underground; historical investigation; World War II.

***Acknowledgements.*** The author is grateful to Tatyana V. Podolyak, doctor of science (philology), docent, professor of the department of mediology, faculty of journalism, Belarusian State University, for the help in preparing the article.

## Уводзіны

Газета «Звязда», першы нумар якой убачыў свет 9 жніўня 1917 г., з'яўляецца найстарэйшым рэспубліканскім выданнем Беларусі. Змяняліся эпохі, адбываліся кардынальныя гістарычныя пераломы, але адна з галоўных газет краіны ніколі на працяглы час не спыняла свайго існавання. Друкавалася «Звязда» і ў найбольш трагічны перыяд для беларускага народа – падчас Другой сусветнай вайны. У акупаваным Мінску выйшлі чатыры нумары газеты (пяты быў падрыхтаваны, але з-за масавых арыштаў падпольшчыкаў тыраж не здолелі надрукаваць і распаўсюдзіць), у партызанскай зоне выдалі 105 нумароў. Журналісты-падпольшчыкі, якія ў гады вайны стваралі газету, унеслі вялікі ўклад у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Многія заплацілі за гэта самую высокую цану – сваё жыццё.

Ролі ключавых фігур, задзейнічаных у падрыхтоўцы падпольнай газеты «Звязда», прысвечана нямала навуковых артыкулаў, манаграфій, партызанскай мемуарыстыкі, дысертацый. Праводзіліся навуковыя канферэнцыі адпаведнай тэматыкі ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя стварэння падпольных рэдакцый, эвакуацыя друкарскіх прылад у партызанскую зону, лёс патрыётаў, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і распаўсюджванні выдання як у акупаваным Мінску, так і ў партызанскай зоне, падрабязна апісаны даследчыкамі ваеннага перыяду газеты «Звязда» М. Дастанкам [1] і Т. Падаляк [2], супрацоўнікамі выдання ў гады Вялікай Айчыннай вайны У. Казачонкам, Я. Савіцкай, А. Шурпачом [3–5], эксклюзіўныя даныя прыводзяцца ў шматлікіх артыкулах гісторыкаўархівістаў Я. Бараноўскага і В. Селяменева. Аднак далёка не ўсе белыя плямы гісторыі ўдалося ліквідаваць.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Дзякуючы аналізу матэрыялаў па гісторыі найстарэйшай газеты краіны ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, правядзенню інтэрв'ю са сваякамі ўдзельнікаў стварэння падпольнага выдання, выяўленню новых звестак падчас навукова-пошукавай працы аўтару гэтага артыкула ўдалося ўстанавіць малавядомыя і не ўведзеныя ў навуковы зварот факты, якія датычацца гісторыі газеты «Звязда» перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Першы рэдактар падпольнай газеты Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк – легенда не толькі нацыянальнай, а і сусветнай журналістыкі. Гэта адзіны рэдактар часу Другой сусветнай вайны, якому было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (падобных прыкладаў на прасторах СССР не было). У няпоўныя 25 гадоў учарашні студэнт мінскага Камуністычнага інстытута журналістыкі (КІЖ) стаў рэдактарам першага падпольнага выпуску газеты «Звязда». Матэрыялы гэтага нумара таемна набіраліся ў будынку сучаснага Дома друку ў Мінску (перад вайной гэта была Друкарня імя Сталіна), дзе падчас акупацыі размяшчалася фашысцкая тыпаграфія. Напярэдадні Уладзімір Амельянюк устанавіў сувязь з рабочымі: бацькам і сынам Воранавымі, якія разам з іншымі супрацоўнікамі – Барысам Пупко, Міхаілам Свірыдавым і Броняй Гофман – увахodзілі ў адну з першых падпольных груп. Падпольшчыкам удалося вынесці

з друкарні амаль усё, што патрэбна было для выпуску газеты: наборныя касы, паперу, фарбы, вярстаткі, гранкі і інш. У выніку 18 мая 1942 г. тыражом у 2500 экзэмпляраў першы падпольны нумар газеты «Звязда» быў надрукаваны ў доме Міхаіла Пятровіча Воранава і яго сына Міхаіла па адрасе вул. Рымарская, 13 (цяпер – вул. Караля). «Акрамя таго, у Воранавых на кватэры друкаваліся хлебныя карткі, карткі для дадатковага пайка, пашпарты, біржавыя карткі, даведкі з месца працы, падробліваліся пячаткі і штампы. Менавіта дзякуючы Міхаілу Воранаву мінскім падпольшчыкам удалося здабыць два экземпляры спіса шпіёнаў у СССР, якія праз партызанскую брыгаду "Дзядзькі Колі" былі адпраўлены ў Маскву. Але за гэта была заплачана вельмі высокая цана. Ад рук фашыстаў загінула сям'я з трох чалавек: бацька, сын і яго жонка. Па ўспамінах падпольшчыка Васіля Сайчыка, Воранавых выдала родная цётка: "Яе затрымалі ў краме, у яе было дзесяць картак хлебных. Спыталі, дзе яна іх бярэ, тая і сказала, што Воранаў даў"»[1].

Многія матэрыялы першага падпольнага нумара газеты напісаны асабіста Уладзімірам Амельянюком. Генадзь Будай, з якім яны сябравалі, працавалі ў дзяржынскай раённай газеце, вучыліся ў КІЖы, а потым уваходзілі ў лік арганізатараў патрыятычнага падполля, сведчыў, што У. Амельянюк спяшаўся, рыхтуючы матэрыялы для першага падпольнага нумара газеты «Звязда»: «Яго блакнот папаўняўся фактамі аб баявых дзеяннях народных мсціўцаў, аб зверствах фашыстаў. Скрупулёзна адбіраў ён найбольш важныя паведамленні Маскоўскага радыё… Шмат якую інфармацыю хацелася змясціць у маленькім газетным лістку. Але трэба было "сціскаць", і Амельянюк па некалькі разоў перапісваў матэрыялы, стараўся ўдыхнуць у іх жар свайго сэрца, усю нянавісць да ворага»[2] [6, с. 78].

Першы падпольны выпуск выдання пачынаўся са звароту да чытачоў: «Таварышы! З сённяшняга дня Мінскі Гарком КП(б)Б аднаўляе выданне свайго органа – газеты "Звязда". Пішыце ў газету аб жыцці партызанскіх атрадаў, аб баявой іх дзейнасці, аб паасобных партызанах, праявіўшых сябе ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Рэдкалегія» (1942, № 1). Журналісты змагаліся з ворагам словам: «Паднімайцеся ўсе, каму дорага наша Радзіма, на ўсенародную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў!» (1942, № 1). Гэта быў сапраўдны подзвіг – выпусціць газету ў тыле ворага.

Праз некалькі дзён пасля гэтай знамянальнай падзеі ў гісторыі Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б (па афіцыйных звестках, 26 мая 1942 г.) у ходзе перастрэлкі з агентам СД Уладзімір Амельянюк быў забіты каля Чырвонага касцёла ў Мінску. На гэтым месцы (цяпер – пл. Незалежнасці) 24 верасня 1980 г. быў адкрыты помнік першаму рэдактару падпольнай газеты «Звязда», а таксама іншым журналістам-падпольшчыкам, якія падчас акупацыі ўдзельнічалі ў яе выданні. Як зазначае ў сваім даследаванні Т. У. Падаляк, «да гэтага часу біяграфія Уладзіміра Амельянюка цалкам не вывучана. Невядомы лёсы яго жонкі і сына, якому перад вайной было каля трох гадоў» [2, с. 120].

Падчас даследавання гісторыі газеты «Звязда» перыяду Вялікай Айчыннай вайны ўдалося часткова справіцца з гэтай задачай – высветліць дэталі трагічнага лёсу сваякоў Уладзіміра Амельянюка. Яны таксама цесна супрацоўнічалі з Мінскім падпольным гаркамам КП(б)Б. Бацьку галоўнага рэдактара, Сцяпана Кандратавіча, 9 мая 1942 г. забілі акупанты. Сястра Зінаіда трапіла пад бамбёжку яшчэ на пачатку вайны. Маці, Паўліна Сцяпанаўна, памерла 24 мая 1945 г. «на вуліцы ад разрыву сэрца»[3].

Гэта інфармацыя пацвердзілася і ва ўспамінах падпольшчыцы Марыі Рынкевіч, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Член Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б Марыя Рынкевіч, якая таксама ўдзельнічала ў выданні нелегальнай газеты «Звязда», засведчыла: «Ёй (Паўліне Сцяпанаўне Амельянюк. – *В. К.*) было 60 гадоў. Вайна нанесла шмат гора: разбіла вялікую дружную сям'ю (загінулі муж, сын, дачка, унукі). Акупанты з кулямёта абстралялі іх хату. Яна бачыла спалены горад, шыбеніцы, слёзы мацярок. Але гэта не зламала маці, жанчыну, чалавека. Для ўвекавечвання яе светлай памяці прапаную добраўпарадкаваць яе магільны пагорак (яна пахавана на могілках па Даўгабродскай)»[4]. Для таго, каб высветліць, дзе знаходзіцца магіла Паўліны Сцяпанаўны, аўтарам дадзенага артыкула было праведзена своеасаблівае гістарычнае расследаванне.

Як вядома, на сучаснай вул. Даўгабродскай у Мінску пахаванняў не існуе. Найбліжэй да яе знаходзяцца Вайсковыя могілкі. У гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пасля вызвалення Мінска там хавалі людзей. Адшукаць магілу чалавека, усіх сваякоў якога, па ранейшых звестках, забрала вайна, дапамаглі ў адміністрацыі Вайсковых могілак. Пахаванне аказалася добраўпарадкаваным. На пастаменце змешчаны наступны надпіс: «Дарагой маці і бабулі Паўліне Сцяпанаўне Амельянюк ад дзяцей і ўнукаў». Гэта стала сапраўдным адкрыццём: атрымліваецца,

[1] *Канюта В.* Няма ніводнай газеты ў свеце, якой народ паставіў бы столькі помнікаў // Звязда. 2017. 9 жн. (№ 151). С. 7.
[2] Тут і далей пераклад наш. – *В. К.*
[3] *Канюта В.* З роду Амельянюкоў // Звязда. 2017. 18 мая (№ 92). С. 4.
[4] НАРБ. Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 830.

не ўся сям'я Уладзіміра Амельянюка загінула падчас вайны. Было прынята рашэнне напісаць ліст і прымацаваць яго да надмагільнага помніка з разлікам на тое, што хтосьці са сваякоў прыйдзе да магілы, убачыць паведамленне і звяжацца з аўтарам даследавання. У артыкуле, апублікаваным у газеце «Звязда», адзначалася: «Магілу сваёй бабулі, якую ніколі не бачыла, даглядае пляменніца легендарнага журналіста Надзея Амельянюк, дачка Валодзевага брата. Запіску з просьбай адгукнуцца жанчына знайшла побач з помнікам, калі чарговы раз прыехала да пахавання»[5].

Такім чынам, навукова-гістарычныя пошукі прывялі аўтара да пляменніцы Героя Савецкага Саюза. У ходзе інтэрв'ю з Надзеяй Амельянюк высветлілася, што яе бацька, Мікалай Сцяпанавіч Амельянюк, быў старэйшым братам знакамітага журналіста. Невядомы дагэтуль факт з біяграфіі Уладзіміра Амельянюка пацвердзіўся дакументальна. Незадоўга да сваёй смерці іх маці, Паўліна Сцяпанаўна Амельянюк, пакінула ўспаміны, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Яна сведчыла: «Калі пачалася імперыялістычная вайна, я бегла з дзецьмі (у мяне быў хлопчык і дзяўчынка) да Ваўкавыска. Потым усёй сям'ёй, разам з мужам, беглі ў Пскоўскую губерню. На станцыі Дно яму ўдалося ўладкавацца пісарам у ваеннай хлебапякарні. Там жылі да 1917 г. На станцыі Дно нарадзілася ў мяне трэцяе дзіця, той самы Валодзечка, які цяпер загінуў»[6].

Яшчэ адна важная для гістарычнага даследавання дэталь: у паведамленні аб гібелі малодшага сына, якое Паўліна Сцяпанаўна атрымала з Беларускага штаба партызанскага руху, датай смерці Уладзіміра Амельянюка значыцца 30 мая 1942 г. (згодна з афіцыйнымі данымі, журналіст-падпольшчык загінуў 26 мая 1942 г.). Паводле той жа крыніцы, бацька героя быў забіты раней – 9 мая. Надзея Амельянюк сведчыць, што «дзядулю (Сцяпана Кандратовіча Амельянюка. – *В. К.*) замучылі ў Трасцянцы. Бабуля (Паўліна Сцяпанаўна Амельянюк. – *В. К.*) неаднойчы называла прозвішча здрадніка (сёння наўрад ці ўспомніш), але дакладна ён быў не адзін»[7].

У ходзе інтэрв'ю з пляменніцай журналіста-падпольшчыка высветлілася яшчэ адна гістарычная недакладнасць: «Бацька казаў, што Валодзя нарадзіўся ў канцы года: ці то ў лістападзе, ці то ў снежні. Ён дакладна помніў, што было холадна і нават ляжаў снег. Адкуль узялася дата нараджэння 20 мая, не ведаю»[8]. Мікалай Амельянюк быў старэйшы за свайго знакамітага брата на пяць гадоў.

Унесла некаторыя карэктывы Надзея Амельянюк і ў апісанне абставін гібелі журналіста. Аптэка непадалёк ад Чырвонага касцёла, каля якой забілі Уладзіміра Амельянюка, працяглы час з'яўлялася для падпольшчыкаў месцам перамоў. У той дзень галоўны рэдактар газеты «Звязда» прыйшоў туды на чарговую яўку. Калі выйшаў з аптэкі, адбылася перастрэлка, у ходзе якой ён быў забіты. Ключавая дэталь: забіты журналіст ляжаў каля аптэкі не адзін дзень – фашысты разлічвалі выйсці на след іншых падпольшчыкаў. Маці Героя Савецкага Саюза, Паўліна Сцяпанаўна, неаднойчы праходзіла каля нежывога сына, але нічога зрабіць не магла: інакш выдала б і сябе, і іншых падпольшчыкаў. Магіла Уладзіміра Амельянюка не выяўлена. І гэта даследчыцкая задача на будучыню. Няма магілы і ў роднай сястры журналіста. Падчас эвакуацыі ў машыну, у якой ехала Зінаіда Амельянюк, трапіла бомба – жанчына загінула разам з двума дзецьмі. Яе муж, ваеннаслужачы, не вярнуўся з фронту.

Ва ўсіх дакументальных крыніцах пазначана, што лёс жонкі Уладзіміра Амельянюка Лідзіі і іх сына Генадзя невядомы. І адна з асноўных версій, паводле якой яны загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны, у ходзе гістарычнага расследавання не пацвердзілася. Па сведчанні пляменніцы журналіста-падпольшчыка, Лідзія і Генадзь Амельянюкі эвакуіраваліся з акупаванага Мінска разам з жонкай і сынам Мікалая Амельянюка: «Дзеці, мой родны брат Сярожа і Гена Амельянюк, памерлі па дарозе. Пасля вайны Ліда выйшла замуж, жыла ў Маскве. Ад другога шлюбу нарадзіла сына. Памятаю, як аднойчы яна прыязджала да нас у вёску. Пакуль была жывая, падтрымлівала стасункі з маёй мамай»[9].

Прайшоўшы не адзін фашысцкі канцлагер, старэйшы брат журналіста-падпольшчыка пасля вайны вёў запісы. Аўтарам артыкула быў уважліва прааналізаваны пасляваенны дзённік Мікалая Амельянюка, у якім ён падрабязна распавядае гісторыю сваёй сям'і. З успамінаў Мікалая Амельянюка: «У 1918 г. бацька ўступіў у партыю. З таго часу пачалася яго служба ў Чырвонай арміі на шматлікіх франтах Грамадзянскай вайны. На пасадзе памочніка каменданта станцыі і ваеннага камісара ў 1919 г. ён змагаўся супраць Юдзеніча і Балаховіча каля Пскова, у 1920–1921-м – супраць белапалякаў каля Барысава і Оршы, супраць Урангеля – каля Джанкоя і Керчы. І ўся сям'я, не адстаючы ад бацькі, калясіла па прасторах Расіі. У 1921 г. бацьку назначылі камендантам станцыі

[5] *Канюта В.* З роду Амельянюкоў. С. 4.
[6] НАРБ. Ф. 750-п. Воп. 1. Спр. 118.
[7] *Канюта В.* З роду Амельянюкоў. С. 4.
[8] Там жа.
[9] Там жа.

Брэст, але па дарозе ў Мінск ён сур'ёзна захварэў і вымушаны быў дэмабілізавацца з арміі. Для аднаўлення здароўя яго адправілі на работу лясным аб'ездчыкам спачатку ў вёску Кайкова, каля станцыі Міханавічы, а пазней – у Каралёўскае лясніцтва, што за 40 кіламетраў ад Мінска (Самахвалавічы. – *В. К.*). Маці, непісьменная жанчына, навучылася чытаць і пісаць, і падчас вандравання сям'і па дарогах Грамадзянскай вайны яна як ніхто здолела выхаваць нас у любові да Радзімы. У рэдкія вольныя хвіліны яна любіла чытаць Пушкіна, Гогаля, Лермантава, і ў лясным доміку, дзе мы жылі, з цягам часу з'явілася невялікая бібліятэка, якой карысталіся і дзеці з суседніх вёсак. У 1924 г. пасля смерці Леніна мы ў сябе дома арганізавалі ленінскі куток, дзе былі сабраны партрэты правадыра, кнігі і брашуры пра яго, разам з іншымі дзецьмі развучвалі вершы, прысвечаныя Уладзіміру Ільічу, спрабавалі выпускаць насценгазету. Валодзя быў зусім маленькі, але прымаў самы жывы ўдзел. Ужо тады ён вылучаўся дапытлівасцю, настойлівасцю і жаданнем усё давесці да канца»[10].

Для Мікалая Амельянюка, старэйшага сына Сцяпана Кандратавіча і Паўліны Сцяпанаўны, вайна пачалася ў 1941 г. Каля Оршы часць, у якой ён служыў, трапіла ў акружэнне. Доўгія тры гады Мікалай Сцяпанавіч знаходзіўся ў палоне, за гэты час змяніў не адзін канцлагер, але выжыў. Пасля вызвалення саюзнікамі трапіў у амерыканскую дывізію, у складзе якой і заканчваў вайну. Дамоў вярнуўся ў 1946 г.: на радзіме яго чакаў лёс ворага народа.

Сапраўднай трагедыяй для Мікалая Амельянюка было іншае – у паўпустой хаце яго чакалі толькі жонка і старэйшы сын (малодшы, як адзначалася вышэй, загінуў падчас эвакуацыі). У кватэры па вул. Чарнышэўскага, 11, якая ў гады Другой сусветнай вайны была канспіратыўнай, яны і жылі па першым часе. Дачка Мікалая Амельянюка згадвала: «Я памятаю гэты дом. Ужо там не жылі, а мама ўсё вадзіла паказваць кватэру, у якой падпольшчыкі вырашалі важныя пытанні. Бацькі пажаніліся ў 1935-м. Да вайны жылі з бабуляй і дзядулем, да Паўліны Сцяпанаўны маці прыехала і тады, калі вярнулася з эвакуацыі. У бацькі была бронь, але ён пайшоў у армію» [11].

Удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны Мікалая Амельянюка прызналі толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля яе заканчэння. Ён яшчэ паспеў расказаць пра лёс знакамітага брата: выступаў у дружынах імя Уладзіміра Амельянюка, быў частым госцем у Дзяржынскай школе № 2, дзе будучы герой працаваў піянерважатым. Запрашалі Мікалая Сцяпанавіча і ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (менавіта брат журналіста-падпольшчыка перадаў у музей Зорку Героя, прысвоеную Уладзіміру Амельянюку пасмяротна да 20-годдзя Перамогі). Мікалай Амельянюк пайшоў з жыцця ў 1988 г. Недастатковасць інфармацыі пра яго тлумачыцца тым, што лёс ваеннапалонных быў незайздросны, гэтыя людзі прыраўноўваліся да ворагаў народа. Ці мог вораг народа быць братам Героя Савецкага Саюза? Пытанне рытарычнае.

## Заключэнне

Многія згаданыя вышэй факты з біяграфіі першага рэдактара падпольнай газеты «Звязда» ўводзяцца ў навуковы зварот упершыню. Новыя дэталі, выяўленыя ў ходзе гістарычнага расследавання, яшчэ раз пацвярджаюць: лёс сям'і Амельянюкоў адлюстроўвае самаадданую барацьбу і вялікую трагедыю беларускага народа ў гады Другой сусветнай вайны, з'яўляецца прыкладам найвялікшага патрыятызму.

Абазначаныя падчас навуковага даследавання дэталі ўносяць істотныя карэктывы і ў гісторыю падпольнай газеты «Звязда», якая ў гады Другой сусветнай вайны выконвала надзвычай важную місію – змагалася з ворагам словам праўды. Невыпадкова дзейнасць сучаснай газеты ў тым ліку накіравана на супрацьдзеянне шматлікім фальсіфікацыям гісторыі ХХ ст.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Дастанка МЕ. *Газета «Звязда» ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – май 1945 гг.).* Мінск: Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна; 1970. 196 с.
2. Падаляк ТУ. *Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі*. Мінск: Беларускі дзяржаўны універсітэт; 2016. 263 с.
3. Філімонаў МЯ, складальнік. *Наша «Звязда», 1917–1967 гг. Зборнік публіцыстычна-мастацкіх нарысаў*. Мінск: Беларусь; 1968. 267 с.
4. Савицкая ЯМ. *Бойцы подпольного фронта*. Минск: Беларусь; 1982. 173 с.
5. Шурпач АС. *І слова кавала перамогу*. Мінск: Беларусь; 1981. 76 с.
6. Будай ГВ. *Свинцом и словом: записки журналиста*. 2-е издание. Минск: Беларусь; 1981. 223 с.

[10] З асабістага архіва Надзеі Амельянюк.
[11] *Канюта В.* З роду Амельянюкоў. С. 4.

## References

1. Dastanka ME. *Gazeta «Zvjazda» w gady Vjalikaj Ajchynnaj vajny (chjerven' 1941 – maj 1945 gg.)* [Newspaper «Zvyazda» during the Great Patriotic War (June 1941 – May 1945)]. Minsk: V. I. Lenin Belarusian State University; 1970. 196 p. Belarusian.

2. Padalyak TU. *Aksijalogija suchasnaj belaruskaj zhurnalistyki* [Axiology of modern Belarusian journalism]. Minsk: Belarusian State University; 2016. 263 p. Belarusian.

3. Filimonaw MYa, compiler. *Nasha «Zvjazda», 1917–1967 gg. Zbornik publicystychna-mastackih narysaw* [Our «Zvyazda», 1917–1967 years. Collection of journalistic and artistic essays]. Minsk: Belarus'; 1968. 267 p. Belarusian.

4. Savitskaya YaM. *Boitsy podpol'nogo fronta* [Fighters of the underground front]. Minsk: Belarus'; 1982. 173 p. Russian.

5. Shurpach AS. *I slova kavala peramogu* [And the word made victory]. Minsk: Belarus'; 1981. 76 p. Belarusian.

6. Budai GV. *Svintsom i slovom: zapiski zhurnalista* [With lead and word: journalist notes]. 2nd edition. Minsk: Belarus'; 1981. 223 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 25.10.2020.*
*Recieved by editorial board 25.10.2020.*